Ярохін А.

# ГАРАЧЫ ЧЭРВЕНЬ СОРАК ПЕРШАГА

**Герой Савецкага Саюза Іван Кірылавіч Варапаеў вызначыўся ў жніўні 1944 года пры фарсіраванні Віслы. Пад агнём ворага артылерыйскім агнём свайго корпуса ён забяспечыў прыкрыццё савецкіх войск пры пераправе. Асабіста кіраваў пераправай гармат. За месяц наступальньтх баёў артылерыя корпуса, якой ён камандаваў, знішчыла 106 варожых танкаў і самаходных гармат, 172 гарматы і мінамёты, больш тысячы гітлераўцаў. У тым жа годзе яму было прысвоена званне генерал-маёра артылерыі.**

**Але сваю першую баявую. загартоўку ён праходзіў у першыя дні вайны на Заходнім фронце пад Слонімам і Баранавічамі, Ляхавічамі і Слуцкам, Мінскам і Бабруйскам, Прапойскам і Гомелем.**

Напярэдадні вайны маёр І. К. Варапаеў, удзельнік баёў у Іспаніі ў 1936–1939 гадах, вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе, камандаваў 84-м артылерыйскім палком 55-й стралковай дывізіі імя К. Я. Варашылава.

Пройдзем слаўнымі баявымі шляхамі нашага земляка маёра І. К. Варапаева ў першыя дні вайны.

Вестку аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны палкі, дывізіёны, асобныя батальёны, роты і ўзводы 55-й стралковай дывізіі імя К. Я. Варашылава атрымалі адначасова з аб'яўленнем баявой трывогі. У той жа дзень апоўначы часці дывізіі прыбылі з Урэчанскіх лагераў на месца сваёй пастаяннай дыслакацыі ў горад Слуцк. Горад было не пазнаць. Пасля фашысцкай бамбёжкі ў ім бушавалі пажары. Атрымаўшы боепрыпасы, 84-ы артылерыйскі полк праз Нясвіж накіраваўся на Баранавічы. Туды ж, але толькі праз Капыль накіраваўся і 107-ы стралковы полк дывізіі.

На світанку 23 чэрвеня ў раён Бярозы Картузскай выступілі астатнія часці, і падраздзяленні дывізіі. Следам за імі пайшлі невялікімі групамі прыпіснікі і папаўненцы для дывізі са Слуцка, Мінска і іншых гарадоў і навакольных вёсак.

На 191-м кіламетры шашы Брэст-Слуцк дывізія ўступіла ў бой з ворагам. На смерць тут ваявалі воіны 11-га стралковага палка, 129-га асобнага знішчальна-супрацьтанкавага дывізіёна і дывізіёна 141-га гаўбічнага палка. 214 воінаў загінулі ў баі каля вёскі Завінн.

Калі варожыя атакі былі адбіты, начальнік штаба дывізіі Г. А. Тэр-Гаспаран загадаў начальніку артылерыі дывізіі палкоўніку С. І. Сямёнаву затрымаць на рацэ Шчары 141-ы гаўбічны, 228-ы стралковы

палкі і іншыя часці дывізіі і арганізаваць абарону каля пераправы праз раку.

У час апошняга штурму пазіцый дывізіі каля вёскі Завінне амаль поўнасцю загінулі застаўшыяся там воіны 129-га асобнага знішчальна-супрацьтанкавага дывізіёна на чале са сваім капітанам Пятром Пятровічам Асташчанкам і падтрымліваемыя яго стралковыя падраздзяленні 111-га стралковага палка. Толькі пасля вайны, застаўшыяся ў жывых камандзіры і байцы, даведаліся, што яны і тыя, што загінулі ў баях, затрымалі ў той дзень на дзве гадзіны перасоўванне да Бабруйска і Мінска галоўнай ударнай групоўкі гітлераўскіх армій "Цэнтр" – 2-ю танкавую групу Гудэрыяна. Фашысты страцілі тут каля трох дзесяткаў танкаў, шмат аўтамашын і бронемашын, бронетранспарцёраў, сотні салдат і афіцэраў. Толькі за кошт вялікіх страт праціўніку ўдалося прарвацца праз заслон. нашых войск на ўсход.

Не менш кровапралітным быў бой воінаў 141-га гаубічнага артылерыйскага і 228-га стралковага палкоў 55-й стралковай дывізіі імя К. Я. Варашылава каля пераправы праз раку Шчару.

Цяжкія выпрабаванні выпалі і на долю артылерыйскага палка маёра І. К. Варапаева.

Набліжаючыся да Баранавіч, наглядальнікі 84-га артылерыйскага і 107-га стралковага палкоў паведамілі аб набліжэнні варожых самалётаў. А ў хуткім часе і ўсе пачулі іх злавесны гул. Дзевятка варожых бамбардзіроўшчыкаў паявілася над горадам. Зрабіўшы круг, самалёты пачалі выкідваць дэсантнікаў у раёне аэрадрома.

Маёр І. К. Варапаеў загадаў лейтэнанту В. Э. Шамадзі адкрыць агонь па дэсанту. У лічаныя секунды батарэя заняла пазіцыю і адкрыла агонь.

Першымі залпамі большасць дэсантнікаў была знішчана ў паветры, а прызямліўшыхся сустрэлі агнём воіны батальёна аэрадромнага абслугоўвання.

У 13 гадзін артылерысты 84-га артылерыйскага палка паявіліся каля Слоніма і адразу ж прыступілі да абсталявання баявых пазіцый, каб дапамагчы часцям і падраздзяленням 121-й і 155-й стралковых дывізій,якія на рубяжы ракі Шчары стрымлівалі шалёны націск пераўзыходзячых сіл 47-га матарызаранага корпуса праціўніка.

Артылерыеты маёра І. К. Варапаева занялі абарону ў лічаныя хвіліны. І гэта было вельмі дарэчы.

Прарваўшыся да Слоніма; праціўнік меў намер з ходу захапіць горад. Але ён; сустрэў упартае супраціўленне часцей і падраздзяленняў 121-й і 155-й стралковых дывізій. Варожыя танкі ішлі напралом. Уся надзея была толькі на артылерыстаў 84-га артылерыйскага палка маёра І. К. Варапаева. І яны ў поўнай меры праявілі сваё воінскае майстэрства, мужнасць і вытрымку. Толькі за другую палавіну дня 24 чэрвеня 84-ы артполк знішчыў 14 гітлераўскіх танкаў.

На наступны дзень раніцай па загаду камандавання маёр Іван Кірылвіч Варапаеў павёў свой полк на злучэнне з асноўнымі сіламі дывізіі. Але яны пасля жорсткіх баёў з ворагам таксама адыходзілі.

Полк адыходзіў з цяжкімі баямі. Кожны рубеж праціўніку даводзілася браць з боем, несучы цяжкія страты. Нёс вялікія страты і сам полк.

Асабліва жорсткія баі разгарэліся пад Пухавічамі. Падыйшоўшы да ракі Свіслачы, полк заняў абарону. На прамую наводку насупраць маста была пастаўлена батарэя лейтэнанта Шамадзі. Палітруком батарэі быў Аляксей Шлееў. Ворагі імкнуліся любой цаной захапіць мост. Яны не лічыліся ні з якімі стратамі. Атакі следавалі адна за адной. Але артылерысты стаялі насмерць.

Артылерысты маёра І. К. Варапаева знішчылі пад Пухавічамі 9 варожых танкаў, шмат гітлераўцаў. Падпускаючы ворага на 200-250 метраў, знішчалі іх шрапнэллю і асколачнымі гранатамі. Сотні фашыстаў знайшлі сваю гібель на подступах да маста праз Свіслач і ў рацэ.

Не атрымаўшы перамогі ў адкрытым баі, гітлераўцы кінуліся шукаць брод праз раку. У другой палавіне дня калона фашысцкіх танкаў, пакінуўшы невялікі заслон каля маста, пацягнулася па беразе ракі да знойдзе нага броду, які знаходзіўся ў некалькіх кіламетрах вышэй маста. Стварылася рэальная пагроза выхаду гэтай групы ў тыл нашых войск, якія абаранялі пераправу.

Маёр Варапаеў загадаў лейтэнанту Шамадзі зняць з пазіцый батарэю і любым коштам не даць праціўніку пераправіцца на ўсходні бераг ракі. Батарэя хутка знялася з месца і своечасова з’явілася перад ворагам. Немцы ўжо распачалі пераправу. Адзін варожы танк падыходзіў да супрацьлеглага берага, другі быў на сярэдзіне ракі, а трэці спускаўся да вады. Некалькі танкаў рухаліся ўздоўж паляны і ўзлеску, які падыходзіў да ракі. Артылерысты лейтэнанта Шамадзі паразілі гэтыя мішэні з першых жа выстралаў, потым ударылі па танках і машынах, якія рўхаліся ўздоўж паляны. Гітлераўцы, мабыць, вырашылі, што наскочылі на засаду і, зрабіўшы некалькі выстралаў, адыйшлі ў глыбіню лесу.

У той дзень яны больш не спрабавалі атакаваць савецкіх артылерыстаў.

А батарэя лейтэнанта Шамадзі была няўлоўнай. Яна з’яўлялася ў самых нечаканых месцах, расстрэльвала фашысцкія танкі і аўтамашыны з пяхотай і тут жа мяняла пазіцыю. Гітлераўцы вымушаны былі выклікаць на дапамогу свой разведвальны самалёт. Ён накіроўваў на батарэю фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў, але батарэя знімалася з месца і вяла ўжо агонь з іншых пазіцый. Калі праследаванне варожай "Рамы" вельмі надакучыла артылерыстам лейтэнанта Шамадзі, Віктар Эрыставіч вырашыў правучыць гітлераўскіх паветраных разбойнікаў. Аднойчы, пасля завісання "Рамы" над рачной касой, на якой знаходзілася батарэя, лейтэнант загадаў

адкрыць агонь па самалёту. Разлікі артылерыстаў аказаліся правільнымі. Варожы самалёт быў збіты.

За мужнасць і адвагу ў барацьбе з ворагам у першыя дні многія артылерысты 84-га лёгкага артылерыйскага палка і іх камандзір Іван Кірылавіч Варапаеў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Лейтэнант В. Э. Шамадзі, у прыватнасці, атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга.

**Ярохін, А. Гарачы чэрвень сорак першага / А. Ярохін // Чырвоны сцяг (Краснаполле). — 1984. — 13 лістапада. — С. 2—3.**